УДК 94(470)"1917.11.00/193":[323.2/3+316.42]

*М. А. Бяспалая*

# Сацыякультурная трансфармацыя: ад перавароту да рэвалюцыі

*З нагоды 100-гадовага юбілею Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі прыкметна праявілася імкненне прадстаўнікоў разнастайных навуковых плыняў ацаніць яе падзеі. У артыкуле разглядаецца сацыякультурны аспект пераўтварэнняў, якія пачаліся з кастрычніка (лістапада) 1917 г. і ў асноўным завяршыліся ў канцы 1930-х гг., і прывялі да фарміравання новай сацыякультурнай сітуацыі, што знайшло адлюстраванне ў Канстытуцыі 1936 г.*

На выбар тэмы аказалі ўздзеянне погляды многіх вучоных: ад Адама Сміта, які лічыў, што матывацыя эканамічных паводзін залежыць ад звычаяў і традыцый грамадства, да Г. Лебона з яго сцвярджэннем аб адзіна істотных зменах, якія адбываюцца ў ідэях, паняццях, вераваннях, і, нарэшце, да высноў Т. Парсанса аб прызнанні глыбокімі толькі тыя змены, што закранаюць сістэму культуры. Такім чынам, засяродзім увагу на сацыякультурных пераменах, якія адбываліся ў савецкім грамадстве і на фактычным матэрыяле абгрунтуем справядлівасць тэарэтычных высноў.

*Мэта даследавання* – прасачыць эвалюцыю сацыякультурных перамен і яе ўплыў на працэс перарастання перавароту ў рэвалюцыю і яе завяршэнне ў канцы 1930-х гг., вынікам чаго стала пераўтварэнне Савецкага Саюза з дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ў дзяржаву працоўных.

Лічым неабходным падкрэсліць заканамернасць кастрычніцкіх падзей 1917 г., якія разгортваліся пад уплывам шматлікіх фактараў: эканамічных, ваенна-палітычных, аграрных, нацыянальных і інш.

Расійская імперыя на пачатку XX ст. аказалася ў ролі «даганяючага». Перад ёй стаяла задача пераадолець адсталасць ад перадавых краін, пазбавіцца «сыравіннага» статусу, фінансавай залежнасці і інш. Шлях мог быць толькі аналагічны таму, які прайшлі перадавыя краіны: індустрыялізацыя, перабудова аграрных адносін, ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі, якая суправаджалася б увядзеннем усеагульнай адукацыі і фарміраваннем навуковых кадраў, высокакваліфікаваных рабочых і г. д.

У грамадскім жыцці абвастрыліся супрацьлегласці паміж памешчыкамі і сялянамі, рабочымі і прадпрымальнікамі, горадам і вёскай, рознымі канфесіямі, паміж самадзяржаўнай формай праўлення і інтарэсамі прагрэсіўных груп насельніцтва і інш.

Своеасаблівую ролю дэтанатара выконвала ўсенародная незадаволенасць вайной, мэты якой для большасці заставаліся незразумелымі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак стомленасць ад вайны, велізарныя ахвяры, эканамічная нестабільнасць, пагроза голаду і іншае выклікалі масавы пратэст у розных пластах грамадства.

У большасці работ, прысвечаных Кастрычніцкай рэвалюцыі, пералічваюцца названыя вышэй прычыны. Безумоўна, усе яны аказвалі ўплыў на ўнутрыпалітычную сітуацыю, аднак самай глыбокай і ўсеахопнай быў псіхалагічны настрой грамадства. Удзельнік падзей, будучы пісьменнік К. Паўстоўскі ўспамінаў: «…слушал разговоры – пьяные и трезвые, робкие и отчаянные, полные покорности и злобы… Было в них только одно общее – надежда на “замирение”, на то, что вернутся с войны солдаты и произведут то “облегчение жизни”, без которого ничего не оставалось делать, как только помирать голодной смертью. <…> крестьяне… ждали только одного – конца войны. Что будет потом, никто не знал. Но все были уверены, что война даром не пройдет и после нее восстановится, наконец, справедливость»[1].

Працэсы, якія адбываліся ў грамадскім жыцці краіны з лютага па кастрычнік 1917 г., часта абазначаюцца навуковым тэрмінам «біфуркацыя», а паводзіны іх удзельнікаў – дэвіянтнымі. Аднак больш выразную іх характарыстыку можна знайсці ва ўспамінах відавочцаў. Напрыклад, К. Паўстоўскі пісаў: «За несколько месяцев Россия выговорила все, о чем молчали целые столетия. С февраля до осени семнадцатого года по всей стране днем и ночью шел сплошной беспорядочный митинг»[2]. Ён вельмі выразна і трапна, калі не сказаць геніяльна, ахарактарызаваў узнікшую сітуацыю: «Все без труда достигнутое и наспех сколоченное после февраля было, оказывается, самым ранним началом новых времен. <…> Не хватало ни душевных сил, ни времени, чтобы как следует разобраться в молниеносном полете истории. <…> Смутное, почти нереальное состояние страны не могло длиться долго. Жизнь народа требовала ясности цели, точного приложения труда»[3].

Больш выразна, дакладна, зразумела сказаць немагчыма, асабліва шматзначны выраз «в молниеносном полете истории». Гэта з пазіцыі стогадовай адлегласці многія падзеі 1917 г. становяцца зразумелымі, а для іх удзельнікаў сітуацыя выглядала вельмі заблытанай.

Ухапіць і падпарадкаваць гэты «молниеносный полет истории» аказаўся пад сілу У. І. Леніну. У магчымасці ўзяць уладу ў рукі бальшавікоў ён пачаў пераконваць паплечнікаў з верасня 1917 г., пасля таго як у Маскоўскім і Петраградскім саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў бальшавікі дасягнулі перавагі. Была пастаўлена задача «…обдумать, как агитировать за это [восстание. – *М. Б.*], не выражаясь так в печати»

[1] Паустовский, К. Г. Сырой февраль // Беспокойная юность. – М., 2006. – С. 152.

[2] Паустовский, К. Г. Водоворот // Начало неведомового века. – Режим доступа: http://paustovskiy.niv.ru/paustovskiy/text/kniga-o-zhizni/nachalo-veka.htm. – Дата доступа: 10.11.2017.

[3] Там же.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[3, с. 240]. У. І. Ленін лічыў, што захапіўшы ўладу ў абедзвюх сталіцах бальшавікі перамогуць «безусловно и несомненно». Ён быў упэўнены, 99 шансаў на 100, што немцы пагодзяцца на перамір’е і галоўная прычына напружанасці ў краіне будзе ліквідавана [6, с. 245]. Дарэчы, у гэтым ён аказаўся правы. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту ў лістападзе 1917 г. пачаў весці перамовы з немцамі і 23 лістапада дамова аб перамір’і на Заходнім фронце ўвайшла ў сілу.

У рабоце «Марксізм і паўстанне» даводзіўся план паўстання: захоп тэлеграфа, тэлефоннай станцыі, арышт Генштаба і ўрада, арганізацыя кіруючага органа паўстання, заклік рабочых да «отчаянного последнего боя» і г. д. У іншых работах лідар партыі патрабуе наладзіць ваенную падрыхтоўку Балтыйскага флоту, сістэматычную прапаганду сярод казакоў, стварыць атрады агітатараў з адпускнікоў і інш. Ён даводзіў сваім аднадумцам, што «Все будущее русской революции поставлено на карту. Вся честь партии большевиков стоит под вопросом» [4, с. 280]. 8 кастрычніка 1917 г. упершыню агучана, што «Промедление смерти подобно!».

Пытанне аб захопе ўлады бальшавікамі пастаянна абмяркоўвалася на пасяджэннях ЦК РСДРП(б). На адным з іх 23 кастрычніка было паведамлена аб тэхнічнай магчымасці ўзброенага выступлення ў Мінску і аб прапанове мясцовых бальшавікоў адправіць рэвалюцыйны корпус на дапамогу Петраграду. У. І. Ленін рашуча патрабуе скарыстацца гэтай прапановай «для начала решительных действий»[4].

Неабходна патлумачыць, што Заходні фронт, камандаванне якога размяшчалася ў Мінску, налічваў каля 1,5 млн салдат і афіцэраў. Сярод іх актыўна прапагандавалі бальшавікі – М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў, В. Г. Кнорын і інш. Напярэдадні рэвалюцыі ў арміях фронту налічвалася звыш 21 тыс. членаў РСДРП(б) і каля 27 тыс. спачуваючых. Такім чынам, настрой салдат Заходняга фронту быў надзвычай важны для поспеху паўстання.

Аб тым, што бальшавікі рыхтуюцца да захопу ўлады, стала вядома. Каб апярэдзіць праціўніка У. І. Ленін вечарам 24 кастрычніка 1917 г. піша ліст да членаў ЦК і канстатуе, што «…положение донельзя критическое. Яснее ясного, что теперь, уже поистине, промедление в восстании смерти подобно. <…> Надо, во что бы то ни стало, сегодня вечером, сегодня ночью арестовать правительство... <…> Было бы гибелью или формальностью ждать колеблющегося голосования 25 октября, народ вправе и обязан решать подобные вопросы [взятие власти. – *М. Б.*] силой, а не голосованием» [7].

Патлумачым, што на 25–26 кастрычніка быў прызначаны ІІ Усерасійскі з’езд Саветаў, і не магло быць гарантыі, што яго дэлегаты прагаласуюць

---

[4] Заседание Центрального Комитета РСДРП(б) 10 (23) октября 1917 г. // В. И. Ленин. Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – М., 1969. – Т. 34 : Июль – октябрь 1917. – С. 392.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за мірную перадачу ўлады ад Часовага ўрада бальшавікам. Тым больш у народзе ўжо замацавалася думка, што адзіна законнымі рашэннямі павінны стаць пастановы будучага Устаноўчага сходу (Часовым урадам прызначаны на 28 лістапада, а бальшавіцкі ўрад перанёс яго на 5 студзеня 1918 г.).

Што ж у гэты час адбывалася ў стане праціўніка? Спашлёмся на ўспаміны вядомага дзеяча партыі кадэтаў, члена Часовага ўрада У. Д. Набокава, бацькі вядомага пісьменніка. Як апошнюю спробу «противопоставить нечто растущей волне большевизма», ён характарызуе стварэнне 14 верасня 1917 г. Савета Расійскай рэспублікі (перадпарламента) на пасяджэнні Усерасійскай дэмакратычнай нарады. У кастрычніцкія дні, незадоўга да выступлення бальшавікоў, міністры Часовага ўрада – члены кадэцкай партыі і яе кіраўніцтва сустракаліся штодзённа для абмеркавання сітуацыі. У гэты час, лічыць У. Д. Набокаў, «большевики работали во всю, все меньше и меньше стесняясь. Положение с каждым днем становилось все более и более грозным. Слухи о предстоящем в ближайшие дни выступлении большевиков ходили по городу, волнуя и тревожа всех». Ён выразна апісвае сітуацыю ў Савеце Расійскай рэспублікі, куды напярэдадні паўстання бальшавікоў прыехаў А. Ф. Керэнскі з просьбай аб падтрымцы і паўнамоцтвах. Па словах У. Д. Набокава, сярод прысутных панавала поўная разгубленасць і адбываўся «особенно поражавший ничтожеством и ненужностью процесс отыскивания <…> ...компромиссных формул... <…> В наиболее решительный момент Совет Республики оказался несостоятельным, он не дал правительству нравственной поддержки... <…> ...результат этого печального и постыдного дня не мог не поднять их (большевиков) духа, не окрылить их надеждой, не придать им решимости... <…> ...в этот день с особенной яркостью выказались отрицательные черты нашей "революционной демократии", ее близорукая тупость, фанатизм слов и формул, отсутствие государственного чутья…» [2, с. 30–31].

Не менш выразную карціну сітуацыі на 25 кастрычніка 1917 г. прадстаўляе тагачасная прэса розных палітычных кірункаў. «Новое время» (буржуазная газета) задае рытарычныя пытанні: «Выступят ли большевики? А если выступят, то справится ли с ними правительство?» і адказвае: «Власть от него совершенно ускользнула». Газета «Сигнал» ставіць пытанне яшчэ больш экзальтавана: «Кто же нас сожрет? Революционная шпана, руководимая молодцами Вильгельма, укравшими у честной российской демократии ее власть, ее престиж… Где же сила, где голос подлинной демократии? Почему она молчит?..» [2, с. 38].

Надзвычай трапная характарыстыка сітуацыі дадзена ў газеце «Известия», друкаваным органе ЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, якая знаходзілася пад уплывам меншавікоў. Мы вымушаны абмежавацца некалькімі, на наш погляд, выразнымі вытрымкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канстатуецца, што «всякие убеждения уже бесплодны, и большевистское восстание, против которого мы все время предостерегали, как против ужасного для страны испытания, организуется и начинается. <…> ...большевики приняли решение произвести новый переворот. Они опираются на широко разлитое недовольство и не менее широкую бессознательность солдатских и крестьянских масс. <…> Но самое ужасное – это то, что большевистское восстание при всякой удаче привело бы к целому ряду гражданских войн. <…> Неужели не ясно, что диктатура и террор не есть средство организации страны?» [2, с. 38].

Зусім іншы настрой адчуваецца ў газеце бальшавікоў «Рабочий путь». Яна даводзіла чытачам, што «последние надежды на мирный исход кризиса изжиты <…> Весь фронт ждет от съезда (II Всероссийского съезда Советов) освобождающего слова в вопросе о войне и мире. Вся сознательная часть беднейшего крестьянства ждет от съезда избавляющего слова в вопросе о земле. <…> Власть Советам! – к этому сводится все в настоящий исторический момент. Это решает и вопрос о мире, и вопрос о земле, и вопрос об Учредительном собрании» [2, с. 38].

Бальшавікі і іх прыхільнікі змаглі на практыцы ажыццявіць тэарэтычныя распрацоўкі У. І. Леніна па захопе ўлады і яе заканадаўчым афармленні. На II Усерасійскім з'ездзе Саветаў, дзе больш за дзве трэці дэлегатаў складалі бальшавікі, былі прыняты лёсавызначальныя дакументы – Дэкрэт аб міры і Дэкрэт аб зямлі. 25 кастрычніка 1917 г. на пасяджэнні Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў У. І. Ленін сказаў знакамітыя словы: «Товарищи! Рабочая и крестьянская революция, о необходимости которой говорили большевики, совершилась».

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў выніку выступлення бальшавікоў і іх прыхільнікаў, улада перайшла ў рукі саветаў спачатку ў сталіцы, а потым паступова ва ўсёй краіне. У сувязі з гэтым паўстае пытанне: 25 кастрычніка адбыўся пераварот ці рэвалюцыя? Прыхільнікі адной і другой версіі актыўна даказваюць сваю правату. Вызначэння гэтых паняццяў таксама шмат. У разнастайных слоўніках этымалогія слова «рэвалюцыя» тлумачыцца як глыбокія якасныя змены ў развіцці грамадства ці як карэнны пераварот у жыцці грамадства. Зыходзячы са сказанага, нельга не заўважыць, што ў кастрычніку–лістападзе 1917 г. адбыўся пераварот, які абмежаваўся захопам улады і дэкларацыяй асноўных кірункаў развіцця. Карэнныя змены ў эканамічным, палітычным, сацыякультурным жыцці пачаліся пасля ўстанаўлення ўлады Саветаў і працягваліся да канца 1930-х гг. Вынік гэтым пераўтварэнням падвяла Канстытуцыя 1936 г., якая атрымала назву «Канстытуцыя перамогшага сацыялізму». У 1937 г. падзеі кастрычніка–лістапада 1917 г. упершыню былі названы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй. Да гэтага ў партыйнай літаратуры, нават у працах У. І. Леніна і І. В. Сталіна, ужываліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паняцці «пераварот», «кастрычніцкі пераварот», «кастрычніцкая рэвалюцыя», «кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Петраградзе» і інш.

У адным з выступленняў 24 лютага 1918 г. У. І. Ленін выказаўся так: «После Октябрьского переворота революция шла вперед…». Такая пастаноўка праблемы нам падаецца найбольш правільнай. Пасля перавароту рэвалюцыйная перабудова ахапіла ўсе сферы, а ў першыя гады савецкай улады найбольш актыўна сацыякультурную. Адразу былі пастаўлены канкрэтныя задачы: ліквідацыя непісьменнасці, палітычнае асветніцтва, антырэлігійная прапаганда і інш. Падкрэслівалася неабходнасць перабудовы сацыякультурнай сітуацыі, стварэння «новага чалавека», светапогляд якога адпавядаў бы партыйнай лініі.

Тэарэтычныя асновы савецкай культурнай палітыкі распрацаваны ў шматлікіх артыкулах У. І. Леніна, А. В. Луначарскага, Н. К. Крупскай і інш. У бальшавіцкай літаратуры знайшлі асэнсаванне ідэі аб існаванні ў грамадстве дзвюх культур, буржуазнай і пралетарскай, аб неабходнасці крытычных адносін да буржуазнай культуры.

Галоўным метадам выхавання савецкага чалавека абвяшчалася культурная рэвалюцыя, важнейшым зместам якой павінна была стаць ліквідацыя непісьменнасці, таму што малаадукаваныя людзі не маглі дакладна ўспрымаць ідэі новай пралетарскай культуры. 29 кастрычніка 1917 г. у сваёй першай дэкларацыі наркам асветы А. В. Луначарскі пісаў: «Усялякая сапраўдная дэмакратычная ўлада ў галіне асветы ў краіне, дзе кіруюць непісьменнасць і невуцтва, павінна ставіць сваёй мэтай барацьбу супраць гэтай цемры. Яна павінна дабіцца ў кароткі тэрмін усеагульнай пісьменнасці шляхам арганізацыі сеткі школ, адпаведных патрабаванням сучаснай педагогікі, і ўвядзення ўсеагульнага абавязковага і бясплатнага навучання» [5] [8, с. 5]. Безумоўна, з пазіцыі сённяшняга дня зразумела, што наркам ставіў нерэальныя задачы.

Ліквідацыя непісьменнасці, нягледзячы на крыклівую агітацыйную кампанію, развівалася павольна. У 1926 г. амаль палова насельніцтва СССР заставалася непісьменнай. Кардынальныя перамены пачаліся з 1930-х гг., з разгортвання індустрыялізацыі. Рашэннямі вышэйшых партыйных і савецкіх органаў у чэрвені–жніўні 1930 г. была пастаўлена задача – «проведение всеобщего обязательного первоначального обучения и ликвидации неграмотности». Паўсюдна ўводзілася абавязковае чатырохгадовае навучанне дзяцей і падлеткаў, а ў гарадах – усенавуч у аб'ёме сямігодкі. У выніку, на студзень 1939 г. (усесаюзны перапіс насельніцтва) доля пісьменных сярод насельніцтва старэй за 9 гадоў дасягнула 81,2 %.

Адначасова разгортвалася сістэма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых: ад школ ФЗН, вытворча-прафесійных курсаў да абавязковай здачы тэхнічнага мінімуму і стварэння шырокай сеткі курсаў, школ, гурткоў

[5] Пераклад аўтара артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічнай асветы. Для адлюстравання больш выразнай карціны скарыстаем наступныя лічбы: у 1914 г. у Расіі налічвалася 106 тыс. пачатковых школ і 231 тыс. настаўнікаў, 4 тыс. сярэдніх школ, 400 вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў; у 1940 г. адпаведна 192 тыс. і 1216 тыс., 65 тыс. і каля 4,6 тыс. У краіне навучалася 13 млн школьнікаў і 1,8 млн студэнтаў.

Партыйная ідэалогія разглядала чалавека як спрыяльны сацыяльны матэрыял для шліфоўкі, таму важнай уяўлялася задача абагаціць народ духоўнымі каштоўнасцямі новага зместу, выхаваць яго на аснове ідэалогіі навуковага сацыялізму, прывіць нормы новай грамадскай маралі і паводзін, пачуцці савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму. Адной з галоўных мэт гэтай работы абвяшчалася дасягненне «вышэйшага віду класавай самасвядомасці» пры дапамозе агітацыі, у тым ліку і сродкамі мастацтва: «песня, эмблема, плакаты, роспіс, архітэктура – усё, што ўздзейнічае на душу, павінна служыць справе агітацыі». Тэарэтыкі культурнай палітыкі лічылі, што «ўсякае відовішча, якое б'е на эфект, можа ўздзейнічаць на чалавека толькі пэўны час, таму ўсе віды мастацтва павінны быць прасякнуты палітыкай, і ў той жа момант да палітыкі ўсё зводзіцца не павінна». Аднак як на практыцы знайсці такую «залатую сярэдзіну», яны не тлумачылі.

Шырока прапагандавалася ідэя аб самадзейнасці працоўных мас і ўсебаковага пашырэння нізавой ініцыятывы. Планавалася адкрыццё школ для дарослых, народных універсітэтаў, спецыяльных сельскагаспадарчых і тэхнічных школ і курсаў, стварэнне вандроўных універсітэтаў і лектарскіх атрадаў дзеля распаўсюджання ведаў. У якасці метадычнага дапаможніка рэкамендавалася кароткая праграма, так званая грамата грамадзяніна, якая давала схему лекцый па асноўных пытаннях прыродазнаўства, гісторыі і сацыялогіі. Галоўная яе мэта – даць асновы камуністычнага светапогляду. Па задумцы аўтараў, праграма адпавядала пастаўленай мэце, таму што прадугледжвала вывучэнне дастаткова шырокага спектра тэм, напрыклад: «Паняцце аб зямным шары», «Асновы астраноміі», «Паходжанне Зямлі», «Далейшае развіццё чалавецтва» і г. д.

Заўважым, што нават улічваючы сённяшнія магчымасці, арганізаваць у агульнадзяржаўным маштабе такія лекцыі нерэальна. Затое праграма добра ілюструе ўтапічныя планы, якія ўзнікалі ад неразумення сапраўднага становішча, непахіснай веры ў сілу загадаў, распараджэнняў і ідэй. Сказанае можна аднесці і да прапановы У. І. Леніна аб стварэнні некалькіх дзясяткаў помнікаў найбуйнейшым грамадскім дзеячам мінулага, а таксама ўсім наватарам у галіне літаратуры, мастацтва і навукі. Планавалася шырока выкарыстоўваць прапаганду праз спецыяльныя барэльефы з надпісамі, адпаведнымі задачам новай культуры, арганізацыю масавых агульных свят, упрыгожванне гарадоў плакатамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

створанымі найбуйнейшымі прадстаўнікамі мастацтва, адкрыццё спецыяльных вітрын з нагляднымі дапаможнікамі і г. д. На думку аўтараў праектаў, гэта дазваляла «шляхам нагляднасці даць малападрыхтаваным масам асноўныя паняцці аб усіх галінах ведаў».

Акрамя асветнага напрамку, ідэя актывізацыі самадзейнасці мас прадугледжвала арганізацыю ўсялякага роду з'ездаў, якія ў хуткім часе сталі прыметным элементам новага жыцця. Амаль кожны грамадзянін Савецкай рэспублікі аказаўся ўдзельнікам розных мерапрыемстваў. Выключнае значэнне атрымалі мітынгі, лекцыі, вусная агітацыя.

Палітычнай асвеце сярод дарослых дзяржава надавала вялікую ўвагу. Падрастаючае пакаленне ідэалагічна можна было выхоўваць у школе. Павярнуць велізарную колькасць дарослых на шлях, вызначаны Камуністычнай партыяй, было складаней. З пераходам да мірнага жыцця стала ясна, што адных дырэктыў аб змесце асветнай працы, заклікаў да яе актывізацыі ўжо недастаткова. Новая сітуацыя патрабавала стварэння сталай сеткі адпаведных устаноў, якімі можна было кіраваць, кантралюючы іх дзейнасць, такім чынам мець пастаяннага праваднікa партыйнай лініі.

Напрыканцы лістапада 1920 г. быў створаны Галоўны палітыка-асветны камітэт. У аснову яго дзейнасці быў пакладзены прынцып аб'яднання ўсіх арганізацый, якія вялі асветніцкую работу сярод дарослых. На працягу сакавіка 1921 г. на месцах ствараліся павятовыя палітасветы. Асноўная нагрузка прыпадала на нізавыя структуры – вясковыя хаты-чытальні і валасныя палітасветы. Такім чынам, на канец 1920 г. бальшавіцкая праграма культурнай рэвалюцыі была ўдасканалена і прыстасавана да мірных умоў.

Задачай палітасветустаноў была прапаганда партыйнай і дзяржаўнай палітыкі. Дзеля гэтага праводзіўся шэраг кампаній палітычнага і эканамічнага характару: дзень кааперацыі, перавыбары сельскіх Саветаў, ячэек МОПРа, Міжнародны дзень юнацтва, пераход на метрычную сістэму, арганізацыя ячэек таварыства «Далоў непісьменнасць», збор сродкаў на розныя патрэбы, двухтыднёвікі друку, тлумачэнні новага заканадаўства па сямейных пытаннях і інш. Спачатку 1926 г. пачалася антыалкагольная кампанія. Партыйныя органы з трывогай адзначалі, што з выпускам «рускай горкай» узрасло п'янства. Антыалкагольную прапаганду прапанавалася весці шляхам арганізацыі адпаведных палітсудоў, выстаў, лекцый, рабіць вечарынкі з цікавымі гульнямі, не дапускаць спіртных напояў на «вечарах спайкі» і г. д.

Распаўсюджанай з'явай сталі масавыя мерапрыемствы, прысвечаныя новым савецкім святам. Пачыналіся яны з гадавіны рэвалюцыі 1905–1907 гг., потым адзначаліся гадавіна Чырвонай арміі, Дзень Парыжскай камуны, Першага Мая, завяршаўся гадавы цыкл святкаваннем чарговых угодак Кастрычніцкай рэвалюцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для апісання мерапрыемстваў выкарыстаем некалькі прыкладаў з сацыяльнага жыцця БССР. Загадчык Лагойскай хаты-чытальні паведамляў: «9 студзеня (1923) адбываліся мітынг і дэманстрацыя сумесна са школай-сямігодкай на чале са старшынёй школьнага савета і двума настаўнікамі. Наперадзе роты усенавуча – міліцыянеры, партыйныя таварышы з вінтоўкамі, і, нягледзячы на завею, пры першых словах Шкілёнка, які стаў на трыбуне на базарнай плошчы, хор вучняў заспяваў "Вы жертвою пали", а міліцыянеры адсалютавалі залпам і разышліся стройнымі радамі. Вечарам адбыўся канцэрт самадзейнасці, чатыры разы праспявалі "Інтэрнацыянал", два разы "Песню братьям", "Смело, товарищи, в ногу", прачыталі брашуру "9 января 1905 года" і паслухалі даклад па гісторыі беларускага руху. Вечар скончыўся спевамі "Беларускай марсельезы"» [1, спр. 174, л. 13].

Наколькі рэвалюцыйная тэрміналогія, заклікі аказаліся незразумелымі насельніцтву досыць выразна паказваюць наступныя эпізоды, якія датычацца пазіцыі настаўнікаў. Некаторыя іх учынкі, напрыклад вывешванне заклікаў «Хай жыве наш правадыр Якуб Колас», сталі аб'ектам крытыкі на Усебеларускай нарадзе агітацыйна-прапагандысцкіх камітэтаў у жніўні 1927 г.: аб іншых выпадках, як «аб элементарнай палітычнай непісьменнасці», паведамляў часопіс «Асьвета». Настаўніца адной вясковай школы ў дзень 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі вывесіла ў школе заклік «Няхай жыве міжнародная сацыял-дэмакратыя». Пры з'яўленні ў класе інспектара другая настаўніца загадала вучням устаць і заспяваць «Адвеку мы спалі, і нас разбудзілі» [1, спр. 199, л. 19].

Прапагандыстам партыйнай ідэалогіі, новай культуры стала моладзь, якая з энтузіязмам падтрымала рэвалюцыйныя заклікі і ўспрыняла рэвалюцыю як сваё кроўнае, а марксізм-ленінізм лічыла вяршыняй дасканальнасці. «Мы ўзышлі на беларускіх палях, узараных плугамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, расцём мы ў час пераходу яе да камунізму. Гэты час характарызуецца сваёй асаблівай культурай – культурай камуністычнага грамадства. Мы – маладняк гэтых новых усходаў – і разрастаемся на палях беларускага мастацтва, каб здзейсніць у ім ідэі матэрыялізму, марксізму і ленінізму», заяўлялі сябры літаратурнага аб'яднання «Маладняк» [9, с. 14].

На пачатку 1920-х гг. вялікае значэнне ва ўзмацненні ідэалагічнага ўздзеяння на масы пачало надавацца антырэлігійнай прапагандзе. XII з'езд РКП(б) прыняў рашэнне: «Прыступаючы да пастаноўкі сістэмы антырэлігійнай прапаганды і агітацыі як аднаго з дзейсных сродкаў пашырэння партыйнага ўплыву на шырокія працоўныя масы… падкрэсліваем, што толькі праз арганізацыю шырокай сеткі палітасветустаноў, планамернае забеспячэнне вёскі кніжкай і газетай створыцца глеба для канчатковага і поўнага выкаранення рэлігійных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забабонаў». Савецкая ўлада пачала наступ на важнейшую частку духоўнай культуры народа. У хуткім часе з'явіліся справаздачы аб спектаклях, сярод якіх найбольшай папулярнасцю карысталася п'еса «Бог-отец, Бог-сын и К°».

Партыйнае кіраўніцтва разумела вялікую ролю бібліятэк і кнігі ў палітычнай асвеце. Працэс фарміравання фондаў бібліятэк быў падпарадкаваны ідэалагічным задачам. За адпаведнасцю бібліятэчных фондаў сачылі пільна. У адным з актаў рэвізіі бібліятэкі пры народным доме ў Заслаўі падкрэслівалася, што пры аглядзе фонду «выданняў сацыялістаў-рэвалюцыянераў і іншых партый не аказалася, усе кнігі палітыка-асветніцкага і навуковага характару».

З сярэдзіны 1920-х гг. Савецкая дзяржава стала карыстацца больш эфектыўнымі сродкамі масавай інфармацыі – радыё і кіно. Дзякуючы зрокавай і слыхавой даступнасці, яны маглі досыць актыўна ўздзейнічаць на малапісьменнае сялянства. Безумоўна, дзейнасць новых сродкаў інфармацыі адразу ж аказалася пад кантролем партыйных і савецкіх органаў і падпарадкоўвалася перш за ўсё выкананню ідэалагічных задач. Першапачаткова дэманстраваліся выпадковыя стужкі, якія былі ў наяўнасці, ад «Савецкія лекі» да «Збору ананасаў». Аднак з развіццём кінасправы з'явіліся новыя карціны: «Барацьба з засухай», «Жонка старшыні рэўкама», «Дарога да шчасця», «Усім на радасць» (аб кааперацыі), «Вораг народа» (аб шкоднасці самагону) і інш. У 1930 г. ствараюцца знакамітыя кінастужкі «Броненосец Потемкин», «Мать», «Путевка в жизнь», «Комсомольск», «Веселые ребята», «Чапаев», «Человек с ружьем» і многія інш. Іх галоўны змест і ідэі – барацьба за справядлівасць, шчасце простага чалавека, пераадоленне розных перашкод у барацьбе за светлае будучае Радзімы.

Непараўнальныя магчымасці для ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва давала радыё, якое аператыўна і ўсёпранікальна даводзіла інфармацыю. Аднак матэрыяльныя магчымасці не дазвалялі наладзіць шырокае радыёвяшчанне. Распаўсюджванне радыё, як і кіно, пачалося больш-менш прыметна з 1926 г.

З пачаткам у 1930-я гг. актыўнай мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, якую некаторыя даследчыкі прапаноўваюць называць савецкай, з яе поспехамі і няўдачамі звязана частая змена партыйнай лініі. Ад арганізацыі ў гады першай пяцігодкі масавых кампаній пад заклікамі праяўляць «большевистскую сознательность», змагацца за «социальную справедливость» да арганізацыіі ў другой палове 1930- х гг. пастановачных працэсаў-спектакляў над ворагамі савецкай улады і працоўнага народа, з далучэннем да гэтых акцый найбольш актыўных прадстаўнікоў рабочага класа. На змену выснове аб класавай барацьбе, якая абвастраецца ва ўмовах капіталістычнага атачэння, што культывуецца ў пачатку 1930-х гг., паступова прыходзіць ідэя аб непарушным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маральна-палітычным адзінстве савецкага грамадства – рабочых, калгаснага сялянства, працоўнай інтэлігенцыі.

Перабудова прамысловасці і аграрнай галіны суправаджалася, па словах М. Горкага, «огненным взрывом массовой энергии». Зараджаецца і шырока распаўсюджваецца рух ударнікаў, затым стаханаўскі рух, якія ахапілі ўсе галіны вытворчасці. Працягвае ўдасканальвацца ідэя аб рабочым кантролі над вытворчым працэсам і спецыялістамі, што стварала ўяўленне аб далучэнні шырокіх мас да кіравання дзяржавай. Вярхі камуністычнай партыі і савецкай краіны дэманстравалі вернасць прынцыпам сацыяльнай справядлівасці, абвешчаным у кастрычніку 1917 г. Шырока прапагандавалася ліквідацыя беспрацоўя, адбываўся адбор актыўных рабочых на кіруючыя пасады розных узроўняў, матэрыяльна падтрымліваліся перадавікі вытворчасці і г. д.

Актыўная грамадзянская пазіцыя савецкіх людзей была выразна прадэманстравана пры абмеркаванні праекта новай Канстытуцыі, у якім па афіцыйных дадзеных прынялі ўдзел каля 40 млн чалавек, было ўнесена каля 170 тыс. прапаноў. Канстытуцыя, прынятая ў снежні 1936 г., уводзіла ўсеагульнае, прамое, роўнае, тайнае галасаванне для ўсіх грамадзян СССР незалежна ад сацыяльнага паходжання. Канстытуцыя 1936 г. стала першай у свеце, дзе былі зафіксаваны сацыяльныя правы грамадзян на працу, адпачынак, адукацыю і інш. Гэтыя прынцыпы атрымалі сусветнае прызнанне, іх наяўнасць характарызуе любую сучасную сацыяльную сістэму. У Канстытуцыі былі зафіксаваны перамены ў сацыяльнай структуры грамадства, якое складалася з рабочага класа, калгаснага сялянства і працоўнай інтэлігенцыі.

За два дзесяцігоддзі пасля кастрычніка 1917 г. шляхам, з аднаго боку, самаахвярнага энтузіязму, самаадданай працы, з другога – трагічнага лёсу мільёнаў, была пабудавана індустрыяльна-аграрная дзяржава. Самым важным і складаным з'яўляўся працэс фарміравання новага савецкага грамадзяніна, здольнага забяспечваць далейшае эфектыўнае развіццё краіны, разумець і падтрымліваць палітыку партыйных вярхоў. Дзякуючы прываблівасці мэты, разнастайнасці ўжываемых метадаў агітацыі, прапаганды, юнацкаму максімалізму, творчай эйфарыі і многім іншым фактарам сфарміравалася новае пакаленне – жыццярадасных, аптымістычна настроеных, адчуваючых перспектыву людзей. Мільёны іх атрымалі адукацыю, тым самым значна павысілі сацыяльны статус, актывізаваліся іх тэрытарыяльная мабільнасць, далучэнне да здабыткаў савецкай культуры «сацыялістычнай па змесце і нацыянальнай па форме». Розныя віды мастацтва раскрывалі працоўны энтузіязм і гераізм будаўнікоў сацыялістычнага грамадства, выхоўвалі патрыятычныя пачуцці і любоў да сацыялістычнай Радзімы. Калі прыняць да ўвагі заключэнні навукоўцаў, што кожную рэвалюцыю можна лічыць завершанай пасля перабудовы сацыякультурнай сферы, то сацыялістычная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэвалюцыя СССР завяршылася ў канцы 1930-х гг., Канстытуцыю 1936 г. можна называць не толькі Канстытуцыяй «победившего социализма», але і «победившей революции».

*1.* Аддзел народнай адукацыі выканаўчага камітэта Барысаўскага павятовага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 324. Воп. 1. Спр. 174. Л. 13 ; Спр. 199, Л. 19.

*2.* Альманах исторических сенсаций / сост.: В. Гаркин и Дм. Осипов. – М. : Раритет, 1993. – 240 с.

*3. Ленин, В. И.* Большевики должны взять власть. Письмо Центральному Комитету, Петроградскому и Московскому комитетам РСДРП(б) / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – Т. 34 : Июль–октябрь 1917. – М., 1969. – С. 239–241.

*4. Ленин, В. И.* Кризис назрел / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – Т. 34 : Июль–октябрь 1917. – М., 1969. – С. 272–283.

*5. Ленин, В. И.* К рабочим, крестьянам и солдатам / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – Т. 34 : Июль–октябрь 1917. – М., 1969. – С. 284–286.

*6. Ленин, В. И.* Марксизм и восстание. Письмо Центральному Комитету РСДРП(б) / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – Т. 34 : Июль–октябрь 1917. – М., 1969. – С. 242–247.

*7. Ленин, В. И.* Письмо членам ЦК / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – Т. 34 : Июль–октябрь 1917. – М., 1969. – С. 435–436.

*8. Луначарский, А. В.* Культурные задачи рабочего класса. Культура общечеловеческая и классовая / А. В. Луначарский. – Пг. : Изд-во Союза коммуны Северной обл., 1919. – 24 с.

*9. Хоціна, А. І.* Да пытання аб канцэпцыі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў 20–30-я гг. / А. І. Хоціна // Весн. БДУ. Сер. 3. – 1994. – № 3. – С. 11–15.

*M. Bespalaya*

**Sociocultural transformation: from a takeover to a revolution**

*On the occasion of the 100th anniversary of the Great October Socialist Revolution the aspiration of different scientific trends' representatives to assess its events emerged noticeably. The sociocultural aspect of the transformation, which began in October (November), 1917, and was mostly completed at the end of the 1930s and led to the formation of a new sociocultural situation, reflected in the Constitution of 1936, is considered in the article.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 14.11.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ